*Аляксандр Карацееў*

**ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ ЯК СПЕЦЫФІЧНАЯ ФОРМА РАСКРЫЦЦЯ СУТНАСЦІ МУЗЫЧНАГА МАСТАЦТВА (*у кантэксце народнай музыкі і асаблівасцей навучальнага працэсу падрыхтоўкі выканаўцаў на народных духавых і ўдарных інструментах вышэйшай кваліфікацы Беларусі*)**

*У артыкуле разглядаюцца актуальныя пытанні, якія тычацца інтэрпрэтацыі музычнага мастацтва. Інтэрпрэтацыя разглядаецца як спецыфічная форма, якая дазваляе выканаўцы раскрыць сутнасць музычнага твора. Аўтар адзначае, што падчас вызначэння сутнасці інтэрпрэтацыі ў музычным мастацтве неабходна ўлічваць наступныя кампаненты гэтага працэсу: 1) стылістыку творчасці кампазітара і яго твор, які выконваецца; 2) мастацка-вобразнае мысленне выканаўцы ў пэўным творы; 3) ступень падрыхтаванасці слухача да ўспрымання спецыфікі музычнага мастацтва.*

*Alexander Karatseeu*

**INTERPRETATION AS A SPECIFIC FORM OF THE DISCLOSURE OF THE ESSENCE OF MUSICAL ART *(in the context of folk music performers and educational process features of preparation of the pplayers on wind and percussion instruments of the highest qualification of Belarus)***

*The article discusses the current issues relating to the interpretation of music. Interpretation is seen as a specific form, allows the performer to discover the essence of music. The author notes that during the determination of the essence of the interpretation in the musical arts, the following components of this process are to be considered: 1) the style of the composer and his work, which is carried out; 2) artistic and creative thinking in particular artist 3) the degree of preparation of the listener to perceive the specifics of musical art.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сярод розных аспектаў і фактараў, якія дазваляюць спасцігнуць асаблівасць унікальнасці і мастацкай значнасці музычнага мастацтва, важнае месца належыць інтэрпрэтацыі як спецыфічнай форме раскрыцця сутнасці гэтага мастацтва. Музычнае мастацтва як форма грамадскай свядомасці і ўнікальны кампанент мастацкай культуры вылучаецца сваёй спецыфікай. Яна спасцігаецца толькі пры ўмове грунтоўнага аналізу розных аспектаў і з'яў, характэрных музычнаму мастацтву. Разгледзім, у чым жа асаблівасці інтэрпрэтацыі мастацкіх твораў ў музычным мастацтве?

Тэрмін «***interpretatio***» ў перакладзе з латыні – гэта «*тлумачэнне*». І калі мы разглядаем інтэрпрэтацыю адносна музычнага мастацтва, то яна выступае як форма творчага раскрыцця мастацкага вобраза музычнага твора непасрэдна самім выканаўцам, яго трактоўку зместу выканваемага музычнага твора. І калі мы звяртаемся да аналізу сутнасці інтэрпрэтацыі ў музычным мастацтве, то павінны вывучыць складнікі гэтай з'явы: 1) стылістыку творчасці кампазітара і яго твор, што выконваецца; 2) мастацка-вобразнае мысленне выканаўцы ў пэўным канкрэтна выканваемым ім творы; 3) ступень падрыхтаванасці слухача да ўспрымання спецыфікі музычнага мастацтва.

Гэтыя кампаненты могуць знаходзіцца ў адной або нават у розных плоскасцях. Але іх пералік прыходзіць ва ўзаемадзеянне толькі дзякуючы яго транслятару – выканаўцу-інтэрпрэтатару музычнага твора.

Аспектам сутнасці тэрміна «*інтэрпрэтацыя*» і самой інтэрпрэтацыі музычнага твора надавалі ўвагу многія спецыялісты [1, с. 5–8], гэтаму пытанню надалі ўвагу і мы ў сваіх працах [2–4]. На працягу доўгага часу многія пытанні, звязаныя паняццем інтэрпрэтацыі, носяць не проста характар актыўнага абмеркавання, але набываюць форму сур'ёзнай праблемы. Вядомыя музычныя дзеячы мінулых стагоддзяў і сучаснасці прысвяцілі нямала прац асвятленню розных аспектаў інтэрпрэтацыі ў музычным мастацтве, пошуку кампрамісаў, спробам сфармуляваць адзіныя крытэрыі ў тэорыі музычнага выканальніцтва. Многія дыскусіі адрозніваюцца гарачымі спрэчкамі пра тое, што ж такое інтэрпрэтацыя ў музычным мастацтве, чаму ўжываецца тэрмін «інтэрпрэтацыя», чаму ён паступова выцясняе больш зразумелае грамадскай свядомасці вызначэнне «*выкананне*»?

Ёсць і больш прыватныя, але не менш важныя тэмы, якія патрабуюць абмеркавання і якія вынікаюць з агульнай праблематыкі: пра стаўленне да аўтарскага тэксту, пра ўзаемаадносіны сучаснага кампазітара і сучаснага выканаўцы, аб праве выканаўцы тлумачыць і «навязваць» слухачу сваё прачытанне аўтарскага тэксту. Гэтыя, а таксама і многія іншыя пытанні, на якія да гэтага часу так і не дадзены адназначныя адказы, не толькі дазваляюць нам зрабіць высновы аб наяўнасці самой праблемы музычнай інтэрпрэтацыі, але і наводзяць на думку аб неабходнасці пастаноўкі яшчэ аднаго вельмі важнага пытання: ці ў праве суб'ектыўныя мастацкія «выказванні» выканаўцы стаць абсалютнай каштоўнасцю, якую магчыма будзе класіфікаваць аб'ектыўнымі крытэрыямі пры ацэнцы? Ці існуе наогул дасканалая інтэрпрэтацыя, калі так, то па якіх прыкметах яе можна вызначыць?

Адзначым, што ў працэсе фарміравання, развіцця і вывучэння музычнага выканальніцтва заўсёды востра вырашалася пытанне аб рацыянальных падыходах для раскрыцця мастацкіх задум аўтараў музыкі з дапамогай тых ці іншых выканальніцкіх формаў і іх транслятараў [3, с. 152–162]. Таму разуменне мастацка-сэнсавага зместу тэкста музычнага твора, яго асэнсаванне і выканальніцкае ўвасабленне былі спалучаныя альбо з суб'ектыўнай трактоўкай твора выканаўцам, альбо з успрыманнем слухачамі з арыентацыяй уласнага разумення на ўжо вядомыя для іх варыянты папярэдняга выканання. На працягу апошніх дзесяцігоддзяў многія аспекты, звязаныя з такім паняццем, як інтэрпрэтацыя, носяць не проста дыскусійны характар, з'яўляюцца актуальным аб'ектам абмеркавання на дыспутах, але і набываюць форму вострай палемікі як у плане тэарэтычных палажэнняў, так і пры вырашэнні творча-выканальніцкіх пытанняў. Вядомыя даследчыкі, педагогі і практыкі музычнага мастацтва ў той ці іншай ступені надалі ўвагу асвятленню розных аспектаў інтэрпрэтацыі ў розных напрамках

музычнага мастацтва, пошуку творчых кампрамісаў, ажыццяўлялі спробы сфармуляваць адзіныя крытэрыі як у тэорыі музычнага мастацтва, так і ў тэорыі выканальніцтва. Зыходзячы з прафесійных інтарэсаў, мы вывучалі праблему інтэрпрэтацыі музычных твораў у кантэксце народнай музыкі і асаблівасцей навучальнага працэсу падрыхтоўкі выканаўцаў на народых духавых і ударных інструментах вышэйшай кваліфікацы Беларусі.

Сярод спецыяльных курсаў тыпавога вучэбнага плана па падрыхтоўцы спецыялістаў духавога мастацтва вычэбная дысцыпліна «Інтэрпрэтацыя народнай музыкі» з’яўляецца адной з асноўных музычна-тэарэтычных і творча-эксперыментальных курсаў па падрыхтоўцы выканаўцаў на народных духавых і ўдарных музычных інструментах. Вывучэнне студэнтамі гэтай вуэбнай дысцыпліны падчас навучальнага працэсу спрыяе пашырэнню ў іх прафесійных ведаў, навыкаў і ўменняў як будучых спецыялістаў музычнага мастацтва вышэйшай кваліфікацыі.

Адзначым, што вучэбная дысцыпліна «Інтэрпрэтацыя народнай музыкі» займае значнае месца ў сістэме падрыхтоўкі кваліфікаваных выканаўцаў на народных духавых і ўдарных музычных інструментах, бо з’яўляецца адзіным вучэбна-творчым комплексам і прадугледжвае вывучэнне студэнтамі такіх састаўных модуляў працэсу інтэрпрэтацыі народнай музыкі, як ***расшыфроўка, аранжыроўка і наступнае выкананне твораў***.

Адпаведна распрацаваным адукацыйным стандартам студэнты павінны авалодаць і засвоіць наступныя сацыяльна-асобасныя, акадэмічныя і прафесійныя кампетэнцыі па відах творча-выканальніцкай дзейнасці: валодаць навыкамі і здольнасцю да міжасобаснай камунікацыі; умець працаваць у камандзе (мастацкі калектыў; працоўны калектыў установы і г.д.); актыўна ўдзельнічаць у творчых мерапрыемствах; быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі і свету, культурных традыцый і рэлігійны поглядаў; карыстацца інфармацыйнымі рэсурсамі для шматбаковага забеспячэння арганізацыйна-кіраўнічай дзейнасці ў галіне народнай творчасці; выкарыстоўваць нарматыўна-прававую базу галіны культуры; валодаць базавымі навукова-тэарэтычнымі, музычна-тэарэтычнымі ведамі і выкарыстоўваць іх для рашэння тэарэтычных, практычных і мастацка-творчых задач у галіне выканальніцкай, педагагічнай і навукова-даследчай дзейнасці і сістэматычна павышаць кваліфікацыю на працягу працоўнай дзейнасці; улічваць псіхалагічныя асаблівасці навучэнцаў і практыкаваць індывідуальны падыход да вырашэння мэт і задач навучання і выхавання ўдзельнікаў аматарскага мастацкага калектыву ці навучэнцаў навучальных устаноў; валодаць навыкамі работы з камп’ютарам, вучэбнымі, метадычнымі, інфармацыйна-даведкавымі, навуковымі выданнямі для выканання навукова-даследчай, творча-выканальніцкай і педагагічнай работы; пастаянна ўдасканальваць выканальніцкае, педагагічнае майстэрства, умець працаваць самастойна з выкарыстаннем сучасных прагрэсіўных методык, тэхнічных сродкаў навучання, вызначаць аптымальныя мэты і стратэгію навучання, быць здольным прапанаваць новыя ідэі і валодаць міждысцыплінарным падыходам пры рашэнні арганізацыйна-творчых, вучэбна-метадычных, педагагічных і творча-выканальніцкіх праблем; актыўна весці музычна-выканальніцкую і музычна-асветніцкую дзейнасць, рыхтаваць канцэртныя праграмы з рознахарактарных твораў у розных формах, жанрах і стылях народнай, акадэмічнай, эстраднай музыкі з улікам пошука і ўвасаблення мастацкай інтэрпрэтацыі музычных твораў; ствараць асабістыя варыянты адаптацыі музычных твораў у выглядзе камп’ютарных версій на электронных носьбітах у розных формах, жанрах і стылях народнай, акадэмічнай, эстраднай музыкі для музычных калектываў розных творчых кірункаў (музычных, музычна-харэаграфічных, музычна-харавых).

Мэта вучэбнай дысцыпліны «Інтэрпрэтацыя народнай музыкі» – забеспячэнне падрыхтоўкі студэнтаў да будучай самастойнай творчай працы ў якасці канцэртнага выканаўцы, артыста аркестра ці ансамбля, а таксама і выкладчыка.

Табліца 1 – Тэматычны план вучэбнай дысцыпліны «Інтэрпрэтацыя народнай музыкі»

| **№ п/п** | **Назва тэм заняткаў** | **Агульная колькасць гадзін** | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | семін. | практ. | інд. |
| 1. | Уводзіны. Змест, асноўныя задачы і месца дысцыпліны *«Інтэрпрэтацыя народнай музыкі»* ў сістэме падрыхтоўкі прафесійных выканаўцаў на беларускіх народных духавых і ударных музычных інструментах | 2 | | | |
| 2. | Тэма 1. Сутнасць тэрміна «Інтэрпрэтацыя» і яго выкарыстанне ў народна-інструметальным мастацтве і творчасці | 2 | 1 | | |
| 3. | Тэма 2. Асноўныя мастацкія задачы інтэрпрэтацыі народнай музыкі | 2 | 1 | | |
| 4. | Тэма 3. Састаўныя модулі працэсу інтэрпрэтацыі народнай музыкі (расшыфроўка, аранжыроўка, выкананне) | 4 | 1 | | |
| 5. | Тэма 4. Мастацтвазнаўчы аналіз найлепшых узораў інтэрпрэтацыі народнай музыкі | 2 | 1 | | |
| 6. | Тэма 5. Развіццё творча-практычных навыкаў і ўменняў адаптацыі музычных твораў | | | | 12 |
| 7. | Тэма 6. Тэхналагічныя аспекты творчага працэсу інтэрпрэтацыі твораў народнай музыкі | | | 72 | 48 |
| 8. | Тэма 7. Творчае ўвасабленне інтэрпрэтацыі народнай музыкі | | | 12 | 26 |
| | **УСЯГО 186** | **12** | **4** | **84** | **86** |

Падчас падрыхтоўкі ў вышэйшай навучальнай установе студэнты павінны вырашыць наступнае кола пытанняў і навучальных задач: 1) атрымаць грунтоўныя гістарычныя, музычна-тэарэтычныя веды аб народным духавым і ўдарным музычным інструментарыі не толькі Беларусі, але і аналагічным сусветным музычным інструментарыі ў кантэксце вывучэння гісторыі і сучасных тэндэнцый арганафоніі; 2) развіць адпаведныя музычна-творчыя навыкі вырашэння мастацкіх задач у час выканання расшыфровак, аранжыровак і інтэрпрэтацыі народнай музыкі, якія павінны выкарыстоўвацца будучымі маладымі спецыялістамі ў асабістай мастацка-прафесійнай самастойнай працоўнай творчай дзейнасці па далейшым развіцці традыцый



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народна-інструментальнай спадчыны Беларусі; 3) рэалізаваць асабістыя творча-эксперыментальныя пошукі найбольш эфектыўных мастацка-вобразных інструментальных увасабленняў узораў нацыянальнай народнай традыцыйнай музычнай спадчыны, а таксама лепшых твораў сучасных кампазітараў Беларусі ў галіне народна-інструментальнага мастацтва падчас выканання заданняў па планах індывідуальных, практычных заняткаў, падрыхтоўкі дыпломных работ; 4) асэнсаваць сацыякультурную значнасць, прэстыж і неабходнасць папулярызацыі народна-інструметальнай спадчыны Беларусі на сучасным этапе развіцця мастацкай культуры.

Зыходзячы з вышэйадзначанных задач педагагічнага працэсу і пералічанага кола пытанняў, студэнты падчас навучання ў вышэйшай навучальнай установе маюць рэальную магчымасць дасягнуць дастатковага ўзроўню эрудыцыі для атрымання грунтоўных прафесійных ведаў па сваёй спецыяльнасці. З гэтай мэтай намі распрацаваны тэматычны план вучэбнай дысцыпліны (таб. 1).

За перыяд навучання па вучэбнай дысцыпліне «Інтэрпрэтацыя народнай музыкі» студэнты маюць магчымасць усвядоміць дастатковае кола адпаведных музычна-тэарэтычных прафесійных пытанняў, якія забяспечаць грунтоўную прафесійную падрыхтоўку будучых маладых спецыялістаў, і ведаць змест наступных кірункаў прафесійнай падрыхтоўкі:

I. ***Арыентацыя ў сістэматызацыі, тыпалогіі, рэалізацыі функцыянальных і мастацка-выканальніцкіх асаблівасцей традыцыйных і мадыфікаваных беларускіх народных духавых і ударных інструментаў*** (прынцыпы сістэматызацыі, класіфікацыі, этнаарганалагічныя і функцыянальныя асаблівасці свістковых, лінгвальных, амбушюрных духавых народных, а таксама і ударных, музычных інструментаў, выразна-тэхнічныя магчымасці гэтага інструментарыя, яго натацыя, строй, дыяпазон і г.д.).

II. ***Тэхналагічна-выразныя магчымасці выкарыстання сольнага, ансамблевага, капэльнага выканальніцтва на традыцыйных беларускіх народных духавых і ударных інструментах*** (*solo* у традыцыях народна-інструментальнай практыкі ці з выкарыстаннем сучасных і эксперыментальных выканальніцкіх тэхналогій; *solo* у суправаджэнні фартэпіяна; *solo* у суправаджэнні інструментальнага ансамбля ці капэлы беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў, *кантрапункт*, *музычная арнаментыка* і г.д.).

***III. Асаблівасці дакладнага нотна-графічнага афармлення музычнага твора для беларускіх народных духавых і ударных інструментаў*** (у выглядзе адпаведнага напісання партыі-*solo*, партыі для ансамбля ці аркестра, партытура для ансамбля ці аркестра, дырэкцыёна, клавіра).

***IV. Улік гістарычных эпох і этапаў эвалюцыі народных духавых і ўдарных інструментаў і іх выкарыстанне ў выканальніцкай практыцы*** (тэндэнцыі, якія адбываліся на сусветным узроўні, а таксама і ў нацыянальнай культуры Беларусі).

***V. Параўнальны аналіз выкарыстання розных варыянтаў, інтэрпрэтацый, рэдакцый музычных твораў*** (спецыфіка фіксацыі музычнага матэрыялу вызначаных для апрацоўкі твораў у выглядзе расшыфроўкі, размеркаванне і афармленне музычнага матэрыялу ў творах, які ўжо атрымаў выгляд той ці іншай адаптацыі з выкарыстаннем свістковых, язычковых, амбушурных, народных духавых, а таксама ударных інструментаў).

***VI. Улік сацыякультурнай значнасці творчай адаптацыі музычнай спадчыны Беларусі*** з мэтай яе папулярызацыі мастацка-выразнымі сродкамі беларускіх народных духавых і ударных інструментаў.

Падчас вывучэння дысцыпліны «Інтэрпрэтацыя народнай музыкі» з улікам засваення студэнтамі звестак аб асноўных беларускіх народных духавых і ўдарных інструментах прадугледжваецца фарміраванне і ўдасканальванне ў студэнтаў наступных прафесійных уменняў:

I. ***Параўнальны аналіз і супастаўленне розных штрыхавых камбінацый*** з мэтай іх усебаковага асэнсавання, выяўлення кантрастна-вырыянтных эфектаў, адпаведнай графічна-знакавай фіксацыяй і размеркаваннем адпаведна форме таго ці іншага твора з мэтай яго будучай дакладнай выканальніцкай інтэрпрэтацыі);

II. ***Аператыўная карэктура партый*** для беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў (*solo, ансамбль, капэла)* у выпадку адсутнасці таго ці іншага выканаўцы па аб'ектыўных прычынах і неабходнасці тэрміновай змены ўжо падрыхтаванага музычнага матэрыялу твора);

III. ***Вызначэнне сольных, ансаблевых ці аркестравых цяжкасцей і асаблівасці іх фіксацыі*** (музыказнаўчы, творча-выканальніцкі аналіз, спосабы натацыі ў выглядзе інструментальных партый ці партытур з улікам традыцыйнай і творча-эксперыментальнай выканальніцкай практыкі);

IV. ***Вызначэнне і графічнае афармленне дынаміка-акустычных асаблівасцей*** з мэтай дасягнення будучым выканаўцам на беларускіх народных духавых і ўдарных інструментах лагічнайсці ў насычанасці гучання і дасягненнем адпаведнага дынаміка-насычанага баланса;

V. ***Выкарыстанне падчас вывучэння музычных твораў ці іх нотных фрагментаў асабістых выканальніцкіх уменняў на музычным інструменце*** (напрыклад – базавым як *дудка*, ці на дадатковых абавязковых інструментах, як *жалейка, акарына, дуда*, ці на эпізадычных інструментах, як *саломка, чаратоўка, штархуны, бубен* і г.д.).

Працэс выкладання вучэбнай дысцыпліны «Інтэрпрэтацыя народнай музыкі» павінен ажыццяўляцца на ўзроўні тэхналогіі творча-эксперыментальных пошукаў, мастацкіх увасабленняў з улікам аптымальнага выкарыстання свістковых, язычковых, амбушурных, народных духавых, а таксама щдарных інструментаў. Ён прадугледжвае як лекцыі, так і семінарскія, практычныя, індывідуальныя заняткі. Падчас вывучэння студэнтамі тэарэтычнага і вучэбна-метадычнага матэрыяла развіццё такіх творча-практычных навыкаў, як: 1) вызначэнне дакладнага характару музычнага твора і выбар адпаведнага музычна-інструментальнага арсеналу; 2) выкананне неабходных практыванняў па напісанні сольнай партыі для таго ці іншага народнага духавога інструмента з вызначэннем розных варыянтаў і камбінацый музычна-выразных сродкаў; выяўленне абертонаў, аплікатурных цяжкасцей для кожнага народнага духавога інструмента і іх адпаведнае напісанне ў партытуры ці аркестравай партыі; распрацоўка планаў для выканання самастойнай работы над музычным матэрыялам з мэтай яго размеркавання для народных духавых і щдарных інструментаў. Акрамя гэтага, студэнты таксама маюць магчымасць выканання асабістых заданняў па інтэрпрэтацыі народнай музыкі для розных народна-інструментальных саставаў падчас вытворчай практыкі, у межах падрыхтоўкі матэрыялаў з выкарыстаннем элементаў навукова-даследчай дзейнасці.

З мэтай засваення матэрыялаў вучэбнай дысцыпліны неабходна прапанаваць і выкарыстоўваць прагрэсіўныя метады і тэхналогіі навучання (наглядныя метады, відэа- і аудыа- матэрыялы, наглядныя дапаможнікі, партытуры і інш.), а таксама ствараць спрыяльныя ўмовы для арганізацыі асабістай самастойная работы студэнтаў, якая павінна спрыяць пашырэнню

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кругагляду будучых інтэрпрэтатараў народнай музыкі (з гэтай мэтай неабходна прапанаваць неабходную спецыяльную і нотную літаратуру, запісы канцэртных выступленняў вядучых выканаўцаў і інтэрпрэтатараў народнай музыкі).

**Спіс літаратуры:**

1. Ауэр, Л. Моя школа игры на скрипке. Интерпретация произведений скрипичной классики / Л. Ауэр ; ред., вступ. ст. и коммент. И. Ямпольского. – М. : Музыка, 1965. – 272 с.
2. Карацееў, А. Л. Мэты, задачы, змест і міжпрадметныя сувязі дысцыпліны «Інтэрпрэтацыя народнай музыкі» у сістэме падрыхтоўкі выканаўцаў на народых духавых і ударных інструментах вышэйшай кваліфікацыі (у кантэксце духавога мастацтва Беларусі і музычнай педагогікі) / А.Л. Карацееў // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зб. навуковых прац удзельнікаў V Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 29 красавіка – 1 мая 2011 г.) / БДУКМ ; рэдкал. : Мажэйка М.А. (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2011. – С. 114–116.
3. Коротеев, А.Л. Проблемы формирования художественно-образного мышления специалистов духового искусства / А.Л. Коротеев // Вестник Московского государственного университете культуры и искусств. – № 2(14). – 2006. – С. 152–162.
4. Коротеев, А.Л. Трансформация художественно-творческих форм инструментовки и интерпретации произведений духового искусства в условиях глобализации культуры (белорусские народные и современные оркестровые духовые инструменты) / А.Л. Коротеев // Перспективные инновации в науке, образовании, производстве и транспорте – 2007 : сб. науч. тр. по материалам междунар. науч.-практ. конф. – Одесса : Черноморье, 2007. – С. 26–34. – Т. 16. – История и архитектура, гос. упр., физ. воспитание и спорт, туризм и рекреация.
5. Некрасова, Г. В. Камерная музыка для духовых инструментов с фортепиано (исторический обзор и некоторые вопросы интерпретации) / Г.В. Некрасова // Музыкальное воспитание и образование : матер. Межд. науч. конф. (Минск, 9–12 января 2001 г.). – Минск : БелГИПК, 2001. – С. 104–116.
6. Усманова, А.Р. Гиперинтерпретация // Постмодернизм. Энциклопедия ; сост. и науч. ред.: А.А. Грицанов, М.А. Можейко. – Минск : Интерпрессервис; Книжный Дом, 2001. – С. 158–162.
7. Усманова, А. Р. Умберто Эко: парадоксы интерпретации / А.Р. Усманова. – Минск : Пропилеи, 2000. – 200 с.
8. Фейнберг, С. Пианизм как искусство / С. Фейнберг. – М. : Классика-XXI, 2003. – С. 30.

*Miroslaw Kordowski*

## TAŃCE NARODOWEJ POLSKIEGO FOLKLORU DO CELÓW LITERATURY

*Tańce folklorystyczne są najważniejszą częścią kultury narodowej. Zjawisko to jest typowe dla Polski. Badanie źródeł literackich pozwala wnioskować, że istnienie folklorystycznych tańców narodowych uwarunkowane jest najważniejszą potrzebą człowieka i sposobem życia społeczeństwa. Taniec ludowy wraz z językiem, literaturą, muzyką stanowi integralną część kultury narodowej. W artykule rozpatrzono istotę i znaczenie folklorystycznego tańca narodowego w kontekście literackich studiów nad jego istnieniem w różnych regionach Polski.*

*Miroslaw Kordowski*

## DANCES OF NATIONAL POLISH FOLKLORE IN THE CONTEXT OF LITERATURE

*Folklore dances are the most important part of the national culture. This phenomenon is typical for Poland. The study of literary sources allows us to conclude that the existence of folkloric national dances is conditioned by the most vital need of man and the way of life of society. Folklore national dance, along with language, literature, music, acts as an integral component of national culture. In the article the essence and significance of folklore national dance in the context of literary studies of its existence in various regions of Poland is considered.*

In Poland, dances could be observed in various periods. Some of them are native, other suggest a different origin. They are a mixture of our own, inherited anonymous art of local communities, borrowings from other cultures, and creative, also anonymous, transformations of those borrowings. Until 19th/20th century development of dances shared the same geographical and historical conditions with other elements of culture.

Analytical view of dances in various regions as well as choreographic and technical comparisons were done by Grażyna Dąbrowska in *W kręgu polskich tańców ludowych*, where she distinguished five zones of Polish dancing, each of them covers several neighbouring regions14. 1. The North-West region, including: Silesia, Wielkopolska with Kalisk and western part of Kuyavia, Pomerania with Kashubia, Warmia and Masuria. 2. Central region – covers the whole Masovia with Kurpie, western Podlachia, eastern Kuyavia with Dobrzyń land, Sieradzkie, Łęczyckie and the northern part of Małopolska; 3. Eastern region – East-North and South of Podlachia, Lubelskie, and East-North part of Małopolska. 4. Southern region – covers whole Małopolska without mountains; 5. Mountain region – all Southern regions of the Polish Podtatrze and Tatra mountains: Pieniny, Gorce and Podhale with Spisze and Orawa. The representatives of the mountain region are also Czadca highlanders (pol. *górale*), even though they live near Zielona Góra and Wrocław.

14G. Dąbrowska, *W kręgu polskich... [Among Polish...],* p. 54.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ